# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

А. М. НАРОЎСКАЯ

## СЕМІЯТЫЧНЫ СТАТУС ПОСУДУ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПАЛЕССЯ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольшае распаўсюджанне ў XIX–XX стст. мелі два віды заходнепалескай керамікі – чорнаглянцавая і белагліняная. У Пружанах і Ружанах быў распаўсюджаны чорнаглянцавы посуд: збаны, гладышы, глякі, гарлякі, макотры, друшлакі, слоікі, місы, спарышы і інш. Асноўныя яго функцыі: гаспадарчая, эстэтычная і рытуальная. Звычайна ў этнаграфічнай літаратуры посуд разглядаецца як матэрыяльны аб'ект, але ён з'яўляецца яшчэ і адным з найважнейшых сімвалаў і транслятараў культурных каштоўнасцей. У беларускай традыцыі элементы посуду атасаямляюцца перш за ўсё з часткамі цела чалавека і жывёл, напрыклад збан («горлышка», «рыльца», «тулава», «носік») і г. д. Калі звярнуцца да вобраза галавы як семіятычна найбольш важнай часткі цела, то выяўляецца семантычная адпаведнасць яе іншым мікрасістэмам, у тым ліку посуду [1, с. 43]. На ўзроўні моўнага кода галаве адпавядае гаршчок («чарапкі», «чэрап»). У загадках галава таксама кадуецца як «гаршчок разумны, што сем дзірак мае» [2, с. 113]. Антрапамарфізацыя гаршка праяўляецца як на ўзроўні найменняў («носік», «ручка»), так і ў фальклорных тэкстах, загадках: «Малады Ягор сеў на конь, паехаў у агонь». Асобныя часткі посуду атасаямляюцца з элементамі прасторы, у прыватнасці дома: «дно», «край», «сценка» і г. д. Атаясамленне посуду з чалавекам не абмяжоўваецца тэрміналогіяй. Адной з персаніфікацый посуду можа быць «голас». Добра абпаленыя гаршкі «звіняць». У бітага гаршка «хрыплы» гук. ***Гаршчок*** – адзін з найбольш семіятызаваных прадметаў хатняга посуду. Ён выкарыстоўваўся ў шматлікіх абрадах, рэпрэзентуючы чалавека, – яго галаву

і чэрава, а таксама дом рэальны, зямны і дамавіну апошнюю. У пахавальнай абраднасці гаршчок выступаў як пасудзіна для душы нябожчыка. У Пінскім раёне за труной неслі ў гаршку пасвечаную ваду, якой крапілі магілу. Рэшткі вады вылівалі, а гаршчок, перавярнуўшы дагары дном, ставілі ў голаў магілы. У Кобрынскім пав. Гродзенскай губ. гаршчок, у якім варылася куцця, міску і лыжку адносілі на могілкі і клалі на магілу так, каб міска з лыжкай знаходзіліся пад гаршком [3, с. 528]. На тэрыторыі Беларусі быў распаўсюджаны звычай біцця посуду ў важныя моманты ў жыцці чалавека: «Гаршчок з кашай разбіваюць на хрэсьбінах, чарапкі кладуць на галовы маладым замужнім жанчынам, каб у іх былі здаровыя дзеці» (в. Скепня, Жлобінскі раён); «Гаршчок разбіваюць толькі на адведках, калі ў ім бабіна каша, чарапкі збіраюць і выкідаюць, штоб дзіцёнак не хварэў» (в. Сінічана, Буда-Кашалёўскі раён). Па колькасці чарапкоў судзілі аб колькасці будучых дзяцей («І колькі чарапкоў будзе, столькі будзе дзяцей») (в. Дарашэвічы Гомельскай вобл.). А. Л. Тапаркоў адзначае, што па ўсёй верагоднасці першапачаткова гаворка ішла не пра варажбу, а пра магічныя дзеянні, якія павінны былі прынесці сям'і шматдзетнасць [4, с. 83]. Шматлікія народныя павер'і звязваюць посуд з міфалогіяй атмасферных з'яў. Звычайна выкарыстоўвалі гаршчок для выклікання дажджу: «Трэба было, калі ноччу ўсе спяць, выйсці на вуліцу і ўкрасці ў суседа гаршчок, каб ніхто не бачыў. А потым гаршчок кідалі ў калодзеж, хадзілі вакол калодзежа тры разы і гаварылі словы, заклікаючы дождж» (в. Дуброва, Жыткавіцкі раён); «Гладышку трэба ўкрасць і кінуць у колодясь, каб ніхто не відаў. Сваю гладышку кідаюць у суседні калодесь» (в. Кочышча, Ельскі р-н, Гомельская вобл., запісана ў 1975 г.); «Дзяўчыны з платоў чыстые гладышкі здымалі да кідалі ўвечары» (в. Дубровіца, Хойніцкі р-н, Гомельская вобл., запісана ў 1975 г.); «Ад засухі, калісь казалі, што кідалі гладышку ў калодзец. Гладышку ўдава далжна была ўкрасці ў яўрэя» (г. Хойнікі) [5, с. 104]. Абрады выклікання дажджу былі вядомыя ўсім народам свету. Яшчэ Дж. Фрэзер у сваёй «Золотой ветви» паказаў тыпалагічнае падабенства абрадаў у народаў Еўропы, Афрыкі і Амерыкі [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя тыпалагічнага падабенства Н. І. і С. М. Талстыя вылучылі шэраг асаблівасцей у славянскім і балканскім арэале. Менавіта сувяззю з агнём тлумачыцца функцыя ганчарных вырабаў (гаршкоў, збаноў, гладышоў і г. д.). Ганчарныя вырабы былі звязаны з агнём і дзякуючы гэтаму мелі ўласцівую агню магічную знішчальную сілу над вадой, а значыць і дажджом. Кіданне гаршкоў у ваду павінна было нейтралізаваць іх стрымальную сілу і выклікала дождж. Выкарыстанне гаршкоў вядома і пры правядзенні будаўнічых абрадаў. Так, на Палессі важнае месца адводзілася менавіта гаршку, калі вырашалася пытанне пошуку месца для будаўніцтва дома. Гаршчок выкарыстоўвалі пры пошуку месца для будучага жылля: яго ставілі на тое месца, дзе збіраліся будаваць дом. Калі раса была на гаршку, то, значыць, вада блізка і дом тут строіць нельга. Калі ж гаршчок быў сухі, то можна будаваць дом. Персаніфікацыя посуду з чалавекам, з аднаго боку, і яго сувязь са злымі сіламі, з іншага боку, даюць падставу разглядаць семіятычныя функцыі посуду ў межах апазіцыі *станоўчы/адмоўны*.

***Посуд са станоўчымі прыкметамі. Радзінная абраднасць.*** Посуд – неабходны атрыбут у рытуалах, якія суправаджаюць чалавека ў важныя моманты жыцця. Ён шырока выкарыстоўваўся ў радзіннай абраднасці, у прыватнасці, адчынены і плоскі посуд (міскі, талеркі). Павітуха для палягчэння родаў давала парадзісе зачынены замок, і тая, апускаючы яго ў міску, адмыкала і замыкала. Пасля гэтага жанчына тройчы спрабавала ваду. Посуд выкарыстоўвалі пры першым купанні дзіцёнка, а таксама ў іншых выпадках: «Калі дзіця па начах не спіць, то ў яго пад калыскай ставяць начовачкі – карытца, наліваюць туды гарачай вады з невялікага гаршка, апускаюць у ваду іголку і дзевяць вугольчыкаў і перакульваюць яго дагары нагамі. Ад гэтага дзіця будзе добра спаць усю ноч. У доказ таго, што гэта цудадзейны прыём, на другі дзень амаль уся вада з начовачак збярэцца ў гаршчок» [7, с. 128].

***Вяселле.*** Посуд шырока выкарыстоўваўся ў вясельнай і паслявясельнай абраднасці. Асноўная прымета вясельнага посуду ў рытуале – яе напоўненасць (вадой, збожжам, грашыма і г. д.), галоўнае дзеянне, якое з ёй здзяйсняюць, – пераварочванне «ўверх дном».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Адмоўныя прыметы, звязаныя з посудам.*** Адчынены нанач альбо пусты посуд можа быць небяспечным для чалавека, бо згодна з уяўленнямі, ён можа служыць ёмкасцю для злых сіл. Існуюць спецыяльныя прыёмы засцярогі ад такога посуду: «Калі п’еш з посуду, які прастаяў усю ноч… падуй». Калі пакідаеш міску перавернутай «уверх дном», не кладзі на яе лыжку, каб не залез на яе нячысцік. Такім чынам, асабліва небяспечна пакідаць адкрыты посуд на ноч у панадворку, а менавіта па-за межамі дома, і што найбольш эфектыўным процідзеяннем з’яўляецца яго перастаўленне ўверх дном. Посуд валодае яшчэ адной уласцівасцю, самай значнай у семіятычным плане. Ён супрацьпастаўляецца іншым элементам дома па прымеце *рухомы/нерухомы*. Менавіта гэтая акалічнасць вызначае ролю посуду ў семіётыцы традыцыйнага жылля. Калі прадметы інтэр’ера традыцыйнага жылля: печ, месца для сну «пол», палаці, лавы адносяцца да нерухомых відаў мэблі, то посуд рухомы. Ён мае некалькі месцаў захоўвання і можа перамяшчацца не толькі ў інтэр’еры жылля, але і па-за яго межы: у панадворак для сушкі, у поле ў час сенажаці, у лес для збору ягад, грыбоў. Посуд можа таксама мяняць сваё пражтоаравае становішча (яго можна пераварочваць «уверх дном», класці на бок, вешаць на штыкеціну плота), што таксама мае семіятычнае значэнне. Важнай семіятычнай апазіцыяй посуду з’яўляецца прасторавая: *унутраны/вонкавы* [8, с. 173–174]. Гэта апазіцыя трактуецца амбівалентна. З аднаго боку, посуд, які знаходзіцца ўнутры дома, мае станоўчае значэнне, ён абараняе чалавека ад злых сіл. З іншага боку, калі адчынены і пусты посуд, то ён набывае адмоўнае, небяспечнае для чалавека значэнне. Згодна з экспедыцыйнымі данымі, вынас посуду, як і агню, за межы дома быў строга рэгламентаваны. Да ночы посуд павінен быў вярнуцца дахаты. Такім чынам, прымета «вонкавы» атасаямляецца з прыметай: адмоўны, начны, небяспечны. Посуд які знаходзіцца ўнутры памяшкання, мае станоўчае значэнне, акрамя адчыненага і пустога.

***Верх/ніз.*** У інтэр’еры жылля посуд звычайна размяшчалі ўверсе (падвясныя шкафчыкі, палічкі, у пячурках і выступах печкі і г. д.) альбо ўнізе (на падлозе, услончыках, падполлі). Пры гэтым размяшчэнне посуду наверсе мела пераважна ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ноўчае значэнне ў параўнанні з ніжняй пазіцыяй. У дачыненні да адчыненага і пустога посуду чалавек ужываў прэвентыўныя меры, каб засцерагчы сябе ад злых сіл. Найбольш эфектыўным спосабам былі змены ў апазіцыі верх/ніз, а менавіта перакульванне посуду «ўверх дном». Такое дзеянне пазбаўляла посуд магчымасці «рухацца», «размаўляць» і дапамагаць злым сілам. Гэты ж сродак шырока прымяняўся ў пахавальнай абраднасці: пасля «абмывання» нябожчыка трэба было паставіць «увесь пасуд на ўсход» альбо «ўверх дном». Часам ужывалі іншыя спосабы, напрыклад змянялі месцазнаходжанне посуду ў інтэр’еры жылля.

***Зачынены/адчынены.*** Апазіцыя зачынены/адчынены істотная для бяспекі чалавека, і яе значэнне для кожнай сітуацыі рознае. Для чалавека станоўчай прыметай з’яўляецца зачынены посуд. Адчынены посуд, на думку беларусаў, можа выкарыстоўваць небяспечная для чалавека сіла. Посуд зачыняюць, калі яго нельга перавярнуць, напрыклад, калі ён нечым напоўнены. Асабліва небяспечна было пакідаць адчыненым посуд з вадой. Такім чынам, посуд з’яўляецца адным з найважнейшых сімвалаў і транслятараў культурных каштоўнасцей. Любы штучна створаны посуд валодае утылітарнымі і сімвалічнымі прыметамі і можа быць выкарыстаны і як прадмет, і як знак. Посуд – неабходны атрыбут у рытуалах, якія суправаджаюць чалавека ў важныя моманты жыцця. Ён шырока выкарыстоўваўся ў радзіннай, вясельнай і пахавальнай абраднасці.

1. *Валодзіна, Т. В.* Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 431 с.

2. Загадкі / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.

3. *Топорков, А. Л.* Горшок / А. Л. Топорков // Славянские древности : этнолингвистический словарь. – М., 1995. – С. 526–530.

4. *Топорков, А. Л.* Домашняя утварь в поверьях и обрядах Полесья / А. Л. Топорков // Этнокультурные традиции русского сельского населения XIX – начала XX в. – М., 1990. – С. 67–135.

5. *Толстые, Н. И. и С. М.* Заметки по славянскому язычеству. 2 : Вызывание дождя в Полесье / Н. И. и С. М. Толстые // Славянский и балканский фольклор: генезис, архаика, традиции. – М., 1978. – С. 95–130.

6. *Фрэзер, Дж. Дж.* Золотая ветвь: Исследование религии и магии ; пер. с англ. / Дж. Дж. Фрэзер. – 2-е изд. – М. : Политиздат, 1983. – 703 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Сержпутоўскі, А. К.* Палешукі-беларусы : этнаграфічны нарыс / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 173 с.
8. *Свешникова*, *Т. И.* К функции посуды в восточно-романском фольклоре / Т. И. Свешникова, Т. В. Цивьян // Этническая история восточных романцев: древность и средние века. – М., 1979. – С. 147–195.

І. Н. КОЛАБАВА

## МАНЕТНЫЯ СКАРБЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ПРУЖАНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Утварэнне манетных скарбаў – гэта самы звычайны ў мінулым спосаб захоўвання грашовых сродкаў. Аб шырокім распаўсюджанні падобнага звычая інфармуюць шматлікія гістарычныя крыніцы.

На тэрыторыі Беларусі пачынаючы з XIX ст. зафіксавана адкрыццё больш за 1,5 тыс. грашовых скарбаў. Большасць з іх знаходзілася для зручнасці карыстання на невялікай глыбіні, належаць яны маглі прадстаўнікам самых шырокіх колаў насельніцтва. Геаграфічнае становішча беларускіх зямель і гістарычныя падзеі абумовілі стракаты склад грашовых дэпазітаў, а абставіны часта пазбаўлялі іх гаспадара магчымасці выкарыстаць назапашанае багацце пры жыцці.

Значную цікавасць уяўляе сабой упакоўка, у якой захоўваліся грошы. Гэта магло быць спецыяльна зробленае глінянае начынне, металічная ёмкасць ці проста кавалак тканіны, скуры і інш.

Грашовы скарб – гэта ўнікальная і непаўторная з’ява, у кожнага дэпазіта – свой «твар», які характарызуецца ўласнай храналогіяй, колькаснымі і якаснымі паказнікамі.

Даследаванне асноўных характарыстык такога феномена, як скарб, дае магчымасць адказаць на шэраг пытанняў гісторыі грашовага абарачэння, вызначыць склад грашовых сістэм, узровень эканамічнага, тэхнічнага, культурнага развіцця краіны ў адпаведныя перыяды, а таксама адсачыць міжнародныя гандлёвыя сувязі. Скарбы дазваляюць датаваць розныя прадметы, што былі знойдзены разам з манетамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ